ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнага Камісарыяту.

Асобны №. каштуя усюды 35 кап.

№ 27

ГАЗЭТА КАШТУЯ:	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к.	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	13 р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некулькі №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52.

Масква, 1918 г. 26 Аугуста. **Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц.** І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

В скором времени при Бѣлорусском Національном комиссаріатѣ открываются курсы политическихагитаторов.

В число курсантов принимаются т. т. бѣлоруссы—коммунисты, а также т. т. с рекомендаціями общественных организацій, стоящих на платформѣ **Совѣтской власти**, преимущественно крестьяне и рабочіе. Желающіе поступить на курсы должны подать письменныя заявленія в **Бѣлорусскій Національный Комиссаріат: Москва, Поварская, д. 52.**

О времени открытія курсов будет об'явлено дополнительно.

Зав. агит. отд. **Макаренко.**

Секретарь **П. Закин.**

В Петроградѣ начал выходить новый журнал, посвященный выясненію бѣлорусских нужд, под заглавіем

„Чырвоны шлях".

В журналѣ печатаются статьи выдающихся бѣлорусских публицистов, как на бѣлорусском, так и на русском языках. В журналѣ имѣется отдѣл бѣлорусской художественной литературы.

Пока вышел № 1—2. Цѣна в розничной продажѣ 1 руб. В дальнѣйшем журнал будет выходить не менѣе 2 раз в мѣсяц.

Подписная плата: на год 20 р., на 6 мѣс.—10 р., на 3 мѣс.—5 р. и на 1 мѣс.—2 р.

Адрес: Петроград, Театральная ул. д. 3. Издательство Бѣлорусскаго Отдѣла.

От Центральной Коллегіи о плѣнных и бѣженцах.

Предупрежденіе бѣженцам.

Уполномоченный Центральной Коллегіи Збиневич сообщает, что Коренево, куда направляется теперь много бѣженцев, представляет собой страшную картину постепеннаго вымиранія скопившихся там бѣженских масс в количествѣ двадцати тысяч. Несчастные живут под открытым небом и буквально мрут с голоду. Нѣмецкія власти не пропускают дальше бѣженцев, будто бы из-за холеры, а в самом дѣлѣ холеру они сами вызывают, задерживая несчастных в ужасающих условіях.

Украинская державная варта буквально их избивает. Пропускаются только имущіе. Необходимо широко оповѣстить бѣженцев, что ѣдущіе через Курск на Коренево—обрекают себя на неминуемую голодную смерть.

ЦЕНТРАЛЬНАЯ КОЛЛЕГІЯ О ПЛѢННЫХ И БѢЖЕНЦАХ.

Приказ № 84

7 августа 1918 года.

Мѣстныя Коллегіи о плѣнных и бѣженцах в каждом случаѣ смерти военноплѣннаго или гражданскаго плѣннаго составляют свидѣтельство о смерти по приложенной формѣ, которыя и препровождают немедленно в двух экземплярах в Москву в Административный Отдѣл Центральной Коллегіи о плѣнных, и бѣженцах.

Для сего: 1) всѣ учрежденія, а равно должностныя и частныя лица, в вѣдѣніи коих состоят отдѣльныя группы военноплѣнных и гражданских плѣнных или единоличные военноплѣнные (гражданскіе плѣнные) и 2) вѣдающіе регистраціей смертных случаев Отдѣлы Совдепов — о каждом случаѣ смерти военноплѣннаго или гражданскаго плѣннаго увѣдомлять мѣстную Коллегію о плѣнных и бѣженцах соотвѣтствующим удостовѣреніем с точным указаніем имени и фамиліи умершаго, его подданства, времени и мѣста смерти, причин ея, пользовавшаго врача и мѣста погребенія, а будет возможно то и прочих данных, требуемых для заполненія мѣстной Коллегіей свидѣтельства о смерти.

Эти подлинныя удостовѣренія по составленіи на их основаніи и отсылкѣ в Москву свидѣтельств о смерти, хранятся в дѣлах мѣстной Коллегіи.

О всѣх прежде бывших случаях смерти военноплѣнных или гражданских плѣнных, если в дѣлах поименованных выше учрежденій и лиц имѣются оффиціальныя о сем свѣдѣнія, надлежит поступить также, т. е. и о них должны быть доставлены указанным порядком мѣстной Коллегіей удостовѣренія, а сею послѣдней Административному Отдѣлу Центральной Коллегіи—свидѣтельства о смерти.

Административный Отдѣл Центральной Коллегіи препровождает по одному экземпляру каждаго свидѣтельства о смерти германской и австро-венгерской главной Комиссіи Попеченія о плѣнных, по принадлежности.

Предсѣдатель Центральной Коллегіи

І. Уишлихт.

ДЕКРЕТ СОВѢТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ.

Об измѣненіи ст. декрета Совѣта Народных Комиссаров от 15-го іюля 1918 г. о выходѣ нѣкоторых категорій лиц из Россійскаго гражданства.

Во измѣненіе срока, указаннаго в ст. 1 декрета С. Н. К. от 15-го іюля 1918 г., проживающіе в предѣлах Россійской Соціалистической Федеративной Совѣтской Республики постоянным жителям мѣстностей, отторгнутых от Россіи в силу брестскаго мира, предоставляется на возбужденіе перед Народным Комиссаром внутренних дѣл ходатайства об отклоненіи Россійскаго гражданства дополнительный мѣсячный срок, по истеченіи предоставленнаго им декретом 15-го іюля мѣсячнаго срока.

Предсѣдатель Совѣта Народных Комиссаров **Вл. Ульянов (Ленин).**

Народный Комиссар по иностранным дѣлам **Чичерин.**

Управляющій дѣлами Совѣта Народных Комиссаров **Влад. Бонч-Бруевич.**

Секретарь Совѣта **Н. Горбунов.**

Москва, Кремль, 14-го августа 1918 г.

Масква, 26 аугуста.

Горай ніш усім стала крыуда на бальшавікоу за тоя, што яны захапілі уладу, правым сацыялістам-равалюцанэрам, меньшавіком, народным сацыялістам і другім іх прыяцялям, так сама нібыта сацыялістам. Яны ня маглі аглудзацца доугі час ад тае нячаканае з'явы, якую паказала расейская равалюцыя у сваім нястрыманным паглыбленьню. Маючы некатары час кіраунiцтва над Расеяй і смела ад усяго працоунаго народу гаворучы лагодна і лучачыся блізка з буржуазеяй аж да падзелу між сабою і ею упрауніцтва, яны думалі, што поступ равалюцыі спыніцца на буржуазію [illegible] пад іх наглядам добра і гладка. Але трошку па трошку глеба пад імі траслася, мацунак іх падтрымкі трашчэу, і потым разам знядаволяны імі працоуны народ скінуу іх з мейсту сваіх правадыроу і забрау гэту міссю на сябе, з бальшавікамі упарадзя. Згубіушы нячакана усе — правыя сацыялісты с першых часоу сядзелі цішком, як няпрытомныя, няведаючы за што узяцца і скуль пачаць. І толькі, ачухаушыся, яны пачалі збіраць сілы і старэнна вясці падбухторваньня сярод рабочых і селян супроць спіхнуушых іх бальшавікоу. Дзе ішло словам, а дзе дык прабавалася і дзелам—толькі нічога ня памагала. Ніяк нельга было сабраць сярот расейскаго працоунаго народу тае сілы, на якую б можна было б ім абаперціся і павясці на сваіх варагоу наступ. Дзе спробы ня рабіліся—усюды яны ня вытрымоувалі моцнасцю і прыводзілі да горшых ля іх скуткау.

Гібла надзея, тухла вера на аднауленьня свае улады. І рада украінская, і Каледзін, і Дутау, і Семенау — нічога ня сведчыла ім пасьпехам. Што было рабіць? Ня умерці ж безслауна.

І вось, верныя па служба буржуазеі, няугамонныя правыя с.-р., меньшавікі і іншыя хапіліся за чэха - славацкія гурты. Надзеі іх уваскрослі! Поруч з буржуазеяй, падкупіушай іх, павялі іх супроць расейскіх рабочых і селян, і супроць расейскае равалюцыі. Пашло тоя, што мы бачым.

Толькі і чэха - славакі адны ня абецалі ім сваім нявялікім лікам надзейнае падмогі, і яны, гэтыя варагі працоунаго народу рабска пачалі кленчыць перад чужаземнай буржуазеяй, ці на іх мовя, перад хаурусьнікамі і прасіць яе, каб тая прыслала свае войска у Расею і памагла ім хуччэй расправіцца з працоуным народам. Іх „дзеячы" пасланыя за граніцу і на зборын-

чах і у буржуйных газэтах павялі старэнна агітацыю за умешацяльства хаурусьнікау у Расейскія справы. Бурцау, Керэнскі, Тэрэшчэнка, Ізвольскі — узяушы адну масць і стаушы аднэй хэурай, ня пакідалі галасаваць перад „грамадзянскімі“ коламі хаурусьнікау аб забароня Расеі ад немцау і бальшавікоу. Керэнскі дык на грошы французскаго правіцяльства скалясіу і хаурусныя, і неваюючыя стораны, стараючыся нават пахіліць рабочых на свой бок. І прауда, што датычыць буржуазеі, та прозьбы іх яна хуччэй жа пастаралася выпауніць, зразу ж нарадзіушы шалоны войска і адправіушы яго супроць Расеі. Пауночны край і Мурман ужо заняты, і вядзецца далейшая, хоць і прадлюдна ня абвешчваямая але настаяшчая вайна супроць расейскаго працоунаго народу.

Толькі, чымсь старэнняй прымаецца хауруская буржуазея душыць страшную іой Расейскую равалюцыю, тым сур'езняй пачынаюць бапярэчыць гэтаму рабочыя, якія бачаць у сім і ля сябе вялікую шкоду. У Англі, Францы, Амэрыцца і др. краіох выносяцца імі пастановы і пратэсты супроць замешкі сваіх буржуйных, капіталістычных правіцяльствау у расейскія справы і супроць політыкі сацыялістау згоднікау, памагаючых ім. Гэтыя пратэсты прымаюць гострую хворму і падмацоуваюцца тым настроям, які пачыная уладаць рабочымі грамадамі, хілячы іх да ліваго, бальшавіцкаго напрамку, а так сама і аграмаднымі па усюдах стачкамі.

Буржуазея, бяручы гэта з'явішча на увагу, прымушана усіо яшчэ з апаскаю ды аглядкаю праводзіць задуманую мэту—адчыняную. хвармальную войну ушчаць з народнаю Расеяй.

Тут ікрас на помач ей стараюцца прыйці яе верныя служкі—расейскія правыя с.-р. і меньшавікі. Баючыся, каб дружны наступ расейскіх рабочых ня збіу чэха-славакау, а пахіл у ліва французскіх ды англіцкіх, ня папрашкодзіу далейшай атпраукі у Расею хаурускаго войску, яны зрашылі узяцца ужо і за справу угаворау загранішных „таварышау“ адумацца і ня перамагаць сваім правіцяльствам вясці зьніштажэньня Расейскае Раваэюцыі праз загубства бальшавікоу. Надоячы заграніцаю прадстаунікі гэтых партыяу, ад с.-р. Русанау, а ад меньшавікоу Аксельрод, выдалі свой маніхвэст да сацыялістау хаурусных краін, у яком жывым богам умаляюць ня слухаць бальшавікоу і няспрачацца супроць таго, каб іх буржуазея прагнала ад улады у Расеі. „Бальшавікі,—пішуць яны у сваім маніхвэсця—прадаюць Расею немцам, нішчаць гаспадарства стораны і нацкоуваюць рабочых на сялян робячы між імі разню. Яны зрабілі управу горшую за самадзяржау'я! і г. д.“ Так стараюцца яны капаць яму равалюцыі у угоду грашаунікам, гэтыя купляныя імі шчырыя магільнікі рабоча-селянскай улады.

Ціж паслухая іх рабочы стан другіх старон? Прыклады сучасных здарэнняу паказваюць — што працоуны народ усіх краіоу ясна разумеу, чым і што есцяка ля яго Расейская Сацыяльная Равалюцыя, прыці на забарону яе, ен доуга чакаць пязаставіць. Цану ж усім выступаючым супроць яе варагом, як сацыялістам - хвурманшчыкам буржуазеі, гэтак і самой буржуазеі, ен добра зная. Добра даласся і дасцца яна яму у знак. І як Керэнскі, пошля свае вандроукі, ахованай і аблеплянай у рыжовую мулю буржуйных надзей, астауся с пустым ад рабочых—так сталі ліж с новымі агаляшнікамі напіхачоу буржуазеі п. п. Русанавым і Аксельродам з іх паскудным маніхвэстам.

Цяраз іх голавы працоуны народ другіх краіоу падае рукі расейскаму і суліць падмогу у барацьбе за ахову заваіоу расейскай равалюцыі. Пад надавам паміжнароднаго яго хаурусу ня стрымаюць ніякія сілы у свецця.

Хай помняць гэта згоднікі сацыялісты і буржуазея.

СТАРАЯ РАБОТА.

С пакон вякоу сіберная доля цяжкім камяням вісіць над жыцьціом нашае Беларускае старонкі і яе працоунаго народу. Варта толькі азірнуцца назад ды прасачыць за гэтым жыцьціом на працягу гісторыі, дык сэрца замрэ ад болю, якую яно навейвая—гэтак ціомна і бядова яно. Хто-хто ужо ня здзекувауся над нашым працоуным беларускім народам, хто ня глуміуся над ім, росцячы гэтую бяду і стрымоуваючы гэту яго цемянь!

З роду пакорны і цярплівы—іон маучау, а варагом яго гэтаго толькі і трэба было: карыстаючы яго пакораю—кожны стараўся укусіць яго, ці таухануць у бок, каб ад гэтаго кусу ці тоуху ен пачуу добра, і бараніу на даляй ля іх выгады сваю пакорнасць.

Праз доугі час свайго ужываньня па працоуным беларускім народзя, гэты штурхі і кусы зрабілі тыя зьнішчэньня і зруйнуваньня, якія гібельна і мертвяча адбіліся на яго духоуным развіцццю, пашырэньні культуры і праяве ды адзначэньні нацыянальнай асобнасці і атраджэнні яе здароваго чуцьця: скуткам гэтаго Беларускі народ ачууся з заду усіх другіх. Калі паглядзець на палажэньня, у яком маюцца яго суседзі і узяць маючую у іх сілу грамадзянскай лучнасці і нацыянальнай еднасці, ды зраунiць гэта с тым жа у беларускаго працоунаго народу, та прыходзіцца жахнуцца за тэй вялікай і шкоднай ля яго рожніцы. Літоуцы, латышы, палякі, жыды і другія да таго ясна разумеюць усю карысць цеснай лучнасці і грамадзкаго адзінства, так карыснага у барацьбе з варагамі—што любуяшся іх арганізацыйнасці і ад гэтаго сілы і вагі іх. Гэткія належнасці памаглі ім і у гісторыі захаваць усе пачаткі іх нацыянальных збудоу, пашырыць культуру і даць штырхы да хуткаго развіцця эканамічнаго паляпшэньня у палажэньню.

І чым боляй яны, гэты асобнасці, адзначаюцца, тым валадаючыя ім нацыі хуччэй і пасьпешняй ідуць па шляху поступу і развіцця клясовай барацьбы і здаровай творчасці з яе пагляду. Толькі свабода з усіх бакоу дае сілу працоунаму народу! Вось святая прауда, якоя на бяду усіо яшчэ ня можа запамятаваць сабе беларускі народ, глядзючы на усіо надбаным вокам, скрось бядовая: „няхай сабе“.

Найменьня вырабіць у сябе патрэбных спосабау самаахаваньня і дало можнасць безнаказна гаспадарыць над ім і польскім панам і расейскім царскім чыноунікам, прывіоушым сваім гаспадарствам беларускі народ да цяперашняга упадку і зьнішчэньня.

Вялікая расейская равалюцыя дыхнула свежым і вольным ветрам, які зламау усе пастауленыя прылады ля прыгоннаго уладаньня буржуазеі і чыноуніцтва, і беларускі народ меу змогу пачаць працу над залечкаю сваіх ран. Але ікрас новая бяда зьнішчыла гэту зможнасць. Нямецкі наступ і як скутак яго, акупацыя Беларусі, прынясьлі назат старую цяжкую пору, з яе некатою царскіх і прыгонных парадкау.

На сцэну Беларускаго жыцьця вярнуліся старыя знаемыя беларускаму працоунаму народу дзеячы з сваею працаю—польскія паны і ксендзы. С кожным дніом прыходзяць весткі аб пашырэньні працы апалячваньня польскімі панамі і ксяндзамі беларускаго працоунаго люду. Ля гэтаго імі ня шкадуяцца ні сілы, ні грошай.

Па усёй Беларусі старэнна насаджваюцца польскія школы, адбываюцца рэлігійныя працэсы, вядзецца перапіс жыхароу. Расейскія школы усюды пазачыняны, адчыняць [illegible] даюць немцы, над- патугамі адчыніць обчаствамі селян беларускія (як то было у Буцлаве з гімназ'яю) польскія паны с помаччу нямецкіх штыхоу кладуць свае «вето».

І усяму гэтаму немцы аткрыта спагадаюць навэт патвораюць гэтуй подлуй працы, бо яна і ім выгадна. Тым часам беларускі працоуны народ ня прымая ніякай рады, каб паспрачацца гэтаму. Ляжачая пад бокам «няхай сабе» і тут спанадабілася ікрас і ужываяцца ім ва усю. Мінулы гопыт забыты.

Новы-ж паход польскай буржуазеі на дамакрацкі беларускі нарот у поунум размаху, арэцца і барануяцца глеба ля узросту жаданных ей плепау—вырабу з народа дамакрата і равалюцанэра—надзейшае сілы ля абароны панства буржуазеі, імперыялізмы і іх прыгону.

З аднаго боку старэнная „пазнаньня“ Беларусі нямецкай ваяунічай буржуазеяю пад прадажную згоду прадажнай рады—з другога— паланізацыя з боку польскіх намешчыкау і клярыкальнаго духавенства—сціснулі с двух бакоу працоуны беларускі народці, бы згаварыушыся зьнішчыць яго ня зусім ліхім, але верным спосабам.

Няужэ, родзіцца настойная праханьня—няужэ-ж такі ня угледзіць гэтай новай бяды беларускі працоуны народ, ды ня збярэ сваіх сіл і ня устаня даць ей атпору? Верыцца усіо-ткі у яго сілу і у тоя, што у ем жыве пачуцьціо самаахоВы, якоя падбухторыць хеиць да змаганьня з сіберным варагом! Верыцца, што ен зычна гукне: «Не, памерці, ня дамся!»

Стары С.-Д.

З цыклю „Зоу будзячы“.

(Ахвяруяцца т. т. Я. Петровічу, А. Усціловічу і Я. Лагуну)

IV.

Без работы...

Німа працы—й сэрцу млосна—
Няма[illegible] спакою.
Я так шчыра, я так мосна
Зжыуся з малку з ёю.

Дзень прыходзіць і пытаньня
Раптам лезя у душу:
Што да вечару ад раньня
Я рабіці мушу?

У беглум строма кроу ня л'еіцца,
Рукі звіслі к нізу;
Сэрца вераю ня б'еіцца,
З дукам—адны рызы.

Некім боляй хвіляй гляня
Одгукам надзея—
І у момант жа растаня—
Толькі з'яу навея...

Ходзіш—блудзіш і, здаецца,
У раз бы пау у магілу—
Гэткім болям сэрца рвецца—
Гэтак усе няміла...

І ня тоя, што работа
Голад прыцыняя,
Ва мне родзіць усе клапоты
Й нэндза забірая.

Не, ня тоя! Хоця з гэтым
Сіл ва мне змірыцца,
Але тоя, што ля сьвету
Нечым прыгадзіцца!

Што задарам марна гіня
Хенць мая й ахвоцця
Дні і ночы бязвупынна
Атдаваць рабоця...

Німа працы—цяшка гэта
Мне царпець бяз меры—
Бо у ёй зоу мой, мая мэта—
У ей спадзеу і вера

Цішка Гартны

Таварышы

Селяня і работнікі беларусы! Чытайця і шырця між усімі едзіную шчыра-равалюцыйную беларускую газэту „Дзянніца“. А так сама усе, як хто можа, нясаромяючыся, прысылайця весткі аб жыцьці у вашых местох работнікау і селян, аб усякіх жыцьцявых з'явішчах і трапунках. З за вашаго прыхілу належыць і посьпях і жыцьціо нашае газэты. Нехай яна ня абміне, як нашаго забранаго краю, гэтак і тых куткоу другіх краеу, дзе жывуць браты беларусы.

У школу.

Пачынаяцца новы учэбны год. Пачынаяцца іон ня пры тых варунках, як [illegible] у прашэдшыя часы. Звычайна было, што к восені маладзеж спяшалася [illegible] навукам, наймаліся асобныя дзеля гэтаго настаунікі, якія намуштроувалі сваіх вучняу усякім хітрым штукам, якімі дамагаліся ня пусціць у вышэйшую школу. І было тое, хто меу магчымасць наняць сабе адукатара, той пападау у школу, а у каго у кішені вецяр сьвістау, той нават і сценау школы ня бачыу, ня глядзючы на хэнць, на жаданьне навукі Расейскае Работніча-селянскае правіцяльства, дбаючы аб навучэньні працоунаго люду, мысьлячы, што навука павінна быць даступна дзеля усіх, зрабіла настанову аб адмене усякіх экзаменау дзеля уступленьня у вышэйшую школу, аб адмене падаваць засьветчэньня аб скончэньні сярэдняе школы і аб адмене платы за вучэньня у вышэйшых учэбных установах. Цяпер кожны, хто хоча вучыцца мая на тое поунае права: дзверы вышэйшае школы адзінакава шырока адчыняцца перад носам беднаго.

Расейскі працоуны народ мая вялікую патрэбнасць у навучэньні самога сябе, бо, узяушы уласьць у сваі рукі, іон павінян мець розум карыстацца ею, каб як мая быць нарыхтаваць свае жыцьціо. Дзеля апошняго і трэба шмат ведаць і з разных бакоу: і с чыстае навукі, і у тэхнычных справах, і у прамыслова-гандліовых дзеях, і у сацыяльна-грамадзянскіх адносінах і інш. Усе гэтыя веданьня дасць толькі вольная вышэйшая школа, куды нехай ідзе кожны, у каго іосць жаданьне навукі, прасьветы, жаданьне памагчы сваім братом выйсці с тае цемры, якой яны былі да гэтых часау.

Асабліва вялікую вагу мая новы дэкрэт дзеля нас, працоуных беларусау сярод якіх шмат здатных да навукі людзей, але якія рэдка пападалі у вышэйшую школу, бывушую у нас ліготаю і манаполіяй дзеля панскіх сынкоу. Мы ж, селяне і працоунікі, жылі у цемры, калі-ні-калі успамінаючы аб сваей горкай долі назат у навучэньні. Мала у нас навучаных, а дзеля гетаго гнятуць нас цяпер, як гнялі і уперад. Немцы уводзяць сваі школы, грамату, кніжкі і бяз особнае натугі падчыняюць сабе нашу культуру. Толькі тады мы абаронім сябе, толькі тады будзям супакойны за сваю будучыну, як с простаго народу у нас зложыцца [illegible] інтэлігэнцыя.

Ідзеця ж, браты, у вышэйшую школу, яка шырока адчыняна дзеля вас, нічога ня патрабуя ад вас, апрыч жаданьня навукі. Сьвет навукі ніколі тады ня патухня у вас, і вы панясяце яго у свае хаты, дзе пачняце будаваць новае жыцьціо, калі ня страшны ужо будуць ні немцы, ні паны, ні папы, якія гасілі і гасяць сьвет у вачах народу.

М. Н.

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным боку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 4 г.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52, тал. 1-51-63.

І нацыям дастанецца.

У барацьбе супроць Радавае уласці, супроць бальшавікоу, злучыліся у адну хэуру усе іх варагі, усе непрыяцелі працоунага народу. Бяручы ад правых сацыялістау-равалюцанэрау і меньшавікоу, у агульную сяброускую кампанію увайходзяць: буржуазея, памешчыкі, чорнасотнікі, гандляры і усякая ліха-ліхоя. Усе яны паміж сабою паладзілі згавор, вырахавалі кожны сабе сходную атдзяку і с крыкам: „Далоу бальшавікоу!“ кідаюцца дзе маюць змогу у бойку. Першым чынам у іх ідуць усе патугі на тоя, каб скінуць бальшавіцкую уласць, а тады ужо прымуцца яны уводзіць свае парадкі па раз разроблянаму пляну; адменяць усе заваевы равалюцыі, пералавяць і пераб'юць усіх прыхільнікау цяперашняе управы і кіраунікоу яе і зачнуць уводзіць усім вядомыя, старыя парадкі, якія народ адмяніу праз равалюцыю. Капіталісты прымуцца за сваю працу нажываць процанты, памешчыкі адбяруць зямлю ад селян і вернуць у вёсках тоя жа, які быу да равалюцыі, а селяня і рабочыя прымушаны будуць моучкі ізноу па дванаццаць гадзін у дзень працаваць на іх. Так ужо зроблена у тых местох, дзе гэтуй хэуры народных варагоу удалося с помаччу нанятых імі чэхаславакау дачасна умацавацца.

Усе іх абяцанкі аб паляпшэньню жыцьця, аб спакою і здавольстцвя націхуй ды патрошку захаваюцца надыспод і паміну аб іх ніякаго ня будзя. Цяперака толькі яны перасыпаюць імі свае завабныя рэчы і запрашаньня, каб ціомнаго чалавека звярнуць на свой бок...

Зніштожваючы ж свабоду палітычную, возьмуцца яны і за руйнуваньня і нацыянальнай свабоды, бач адбяруць усе тыя правы, праз якія кожны ня дзяржауны народ, жывучы у Расеі, мая права па своямy будаваць свае жыцьцё, як літоуцы, беларусы, латышы, астонцы ды другія. Нават за гэту справу яны прымуцца куды шчырэй і стэрэнняй, бо у іхной праграмі (парадак) „адбудовы“, як яны кажуць, Расеі пошля атабраньня уласці у бальшавікоу, якую яны трымаюць па пагатовя і агалашаюць, стаіць цэльны цуг частак, у якіх глауным чынам і кажацца аб тым, каб злучыць у „адно усю вялікую Расею, цяперака праз бальшавікоу разадраную у кускі“. Правыя с.-р. і меньшавікі, гэтыя „на ліха казана сацыялісты“, датычна нацыянальнаго пытаньня шчыльна сышліся з самымі заядлымі прыхільнікамі царскіх парадкау. Нацыянальная атраджэньня Расеі, — ня выходзіць з вуст новых велікадзяржауцау, якія, як і у ва усім другім, рашчышчаюць дарожку да новай накоры працоунаго народу усіх нацыяу пад усеахопваючую давячую руку грашауніцтва. На поверх жыцьця, з новым пэнтам, пачнуць выпіхвацца усе пекнасці паліцэйска-цантралістычнае палітыкі і адновяцца усім знаныя і веданыя законы, забараняючыя і пісаньня, і навучаньня на роднуй мовя. З чужых, далекіх мейст, знарок, нашлецца і на Беларусь, і у Літву, і у Латвію ціомная хмара адмысловых руссыфікатарау, якія чужы іх жыцьцю нізашта настараюцца ня дапусціць сярот працоуных народау гэтых нацыяу праявы вольнасці нацыянальнаго духу і пахацень збудоу жыцьця на вольных пачатках нацыянальнаго адзначэньня. Жыдоускі работнік ня мецьмя правоу выяхаць даляй устаноулянай мяжы, а польскі грамадзянін дастаць мейста службы у гасударскуй установя. Беларусу ня дазволяць друкаваць ні газэт ні кніжак па беларуску і нават пастараюцца выкасаваць і самое слова беларус. А даляй, следам пойдуць і цкаваньня і пагромы аднэй нацыі над другой. Гэта работа ікрас месціцца у „нацыянальная атраджэньня“ абвешчваямая галосна з вуст старэнных і правых с.-р. і меньшавікоу, ня кажучы аб тых іх сяброх, што ідуць за імі і з радасці рукі паціраюць. Але, гэтак! Гатовыя прыклады таму ляжаць пад рукою у багатум ліку і за імі іці далека ня трэба! Вобласць войску Данскога, дзе правіцяльства Краснова робіць „чарту аседласці“, Каппказ дзе арудуюць грузіны над другімі нацыямі, Украйна, дзе адменяюцца усе пастановы аб грамадзянах іншых нацыяу, Фінляндзя, с куль высяляюць расейцау і жыдоу і г. д. А поруч с чэха славакамі рухаюць пагромы на жыдоу. Ціж гэта ня страх?

Што гэты страх, страх нацыянальнаго прыгнячэньня, злучаны з прыгнячэннам палітычным, чаго трэба чакаць ад ліхоя супроць-равалюцыі, даушы ей змогу пабор(ы) цяперашняй Радавай уласці, гібелью адаб'ецца на развіцьці усіх забраных народау наагул і беларускаго у асобку—і казаць ня трэба. Асобна беларускаго! Доугі час велікадзяржаунае царскае палітыкі, які вісяу цяжкім камянам над беларускім працоуным народам—прывеу яго да поунаго зніпчэньня, як у культурным, гэтак і аканамічнум напрамку. Тая прасветласць у вольнум будаупіствя, якую запаліла і якую еп поунасцю пя паспеу скарыстаць, равалюцыя, раптам зацемніцца новым зваротам пэражытаго і заб'е пашчэнт працоуны беларускі народ. Вось чаму ен і павіняп цяперака, каб абараніць жыцьцё свае у двайне уцарцяй змагацца з гібельным наступам чорнай сілы, якая плыве у ліку супроць-равалюцыі. Жывучыя у забрануй часцы Беларусі павінны бароцца з буржуазеяю сваею, якая пад тулям „незалежнасці“ цярэбіць сцежку усясьветнай буржуазеі, гэтуй жа супроць-равалюцыі, а закінутыя доляю у Расею, павінны памагаць расейскаму працоунаму народу, помнючы у вайне з ею грозячую гібяльнасць тых скуткау, якія могуць стацца ля беларусау пошля паборы чорных сілау над Радаваю уласцью. І пры сім трэба добра пільнавацца аднэй ісціны, якая кажа: вольная самабудаваньня малых нацыяу—дае сілу поступу. Яно ж можна толькі тагды, калі пануя працоуны народ—які творыць жыцьцё на самуй свабодзя.

Зміжыла.

Камівояжэры Беларускай Рады.

Паміж іншымі справамі, Беларуская Рада старэнна займаецца самарэклямаю; з гэтай мэтаю яна добра наладзіла адправку у Расею, Украіну ды другія месты сваіх пасланцоу. На кожны раз яна даручая ім тую ці іншую міссыю, якіх у яе прызапасяна дужа багата. Траха усе міссыі хіляць к аднаму—гэта агалошваць усюды аб „незалежнасці“ беларускай-народнай распублікі, і шукаць падмогі яе паттрыманьню. Трэба, бач надазаляць людзям, каб яны ня забылі, што нібыта гэтая есняка. Усюды, дзе гэтыя пасланцы ня бываюць, яны, прызнацца, шчыра стараюцца выпаунясць сваю міссыю, толькі карысці ад гэтаго, у рэдкіх местох застаецца як пасланцом, гэтак і Радзя—ат гэтаго ня шмат. Яшчэ сяк-так выходзіць там, дзе спатыкацца радным камівояжэрам прыходзіцца с тымі людзьмі, якія бачаць з гэстаго гандлю сябе выгаду. Гэкак, чарнасотніцкая правіцяльства Украінска-намецкай буржуазеі ахвотна кожны раз гавора з імі і патурая іх прозьбя.

Яно грызнала першым незалежнасць Беларускай распублікі, прыслала свайго консула у Мінск, дало змогу адчыніць гандліоуную палату і нават грашыма пасабляла (амо і пасабляя) працы іх. Вядома—гэта вядзецца у інтарэсах падтрыманьня сваіх. Але апроч Украінскіх скарападнікау, здаецца, ніхто нідзе сяброуна з Беларускаю Радаю адносін ня паставіу і яе камівояжэры дарма сіляцца выпрасіць па ласку Божую да сябе спагады.

Цікауна боляй усяго доля тых пасланцоу, якіх Беларуская Рада пачасту нязабывая надсылаць і сюды, у Савецкую Расею. Каліб яны ня прыехалі—заусягды варочаюцца пазад бяз нічога. А едуць яны у Расею з багатымі надзеямі і моснаю вераю. Нядауна дык гэтым сваім пасланцом-камівояжэрам Беларуская Рада начапіла крыклівая прозвішча „Чрэзвычайная Міссія“ і пакіравала іх проста да т. Чычэрына павядаміць яго, што Беларусь абвешчана незалежнай распублікай, з якой і трэба Расейскай Радавай Распубліцы наладзіць адносіны. Гэтуй дэлягацыі (так Рада празывая сваіх камівояжэрау) была уручана пісьменная просьба, з якою б яна звярнулася і да бывшаго у той час пасла Мірбаха с прозьбаю, узяць яе пад сваю ахову ад прыпадковых зачэпак з боку „бальшавіцкаго правіцяльства“. Аб гэтым знарок прасілі і у Мінску гэн. Фалькенгайна. Прыехаушы у Маскву у ліку чатырох—гэты пасланцы нават ня дабіліся прыняцца у т. Чычэрына, а гаранты бяспечнасці у Мірбаха, і ціпком раз'ехаліся, пакінуушы у Маскве аднаго—А. Цвікевіча, шукаць тых ці іншых матэр'ялау навуковых аб Беларусі. Апроч гэтай „місыі“ пачасту чуць ня кожны тыдзянь наяхджаюць у Маскву адзінотныя „вандроунікі“ з Рады і кожнай паездкай нязабываюць нават зварочвацца праз тых ці іншых людзей да Беларускаго Камісар'яту с тымі ці іншымі просьбамі. Гэтак, усіо прабуюць яны наладзіць якісь „кантакт“ з лівым крылом Рады у нібыта палітычнуй працы, і даляй. Афіцыяльна, кажу, да Камісар'яту яны ня зварочваюцца і нават пабойваюцца паказвацца ля яго, ведаючы добра, чым пахня з боку Камісарьяту „кантакт“. І кожны раз пакідаюць Расею ні шчым. Надоячы ізноу быу, як мы даведаліся, у Маскве пасланец ад Беларускае Рады і на гэты раз ужо ен прыяхджау „збіраць“ сваіх людзей. Як ведама, ля тэй паскуднай працы, якая вядзецца „Мінскім Правіцяльствам“ навэт і буржуазных і чорнасотніцкіх элементау ня дастае на месця. І Рада стараецца вылавіць усю гэту гадасць з рожных куткоу Расеі, дзе яны водзяцца тайком. У Маскве тут маяцца колісьці згуртаваная беларуская Народная Грамада, у якой сышліся усе чорнасотнікі-руссыфікатары, улучаючы і Салапевіча, і рэакцыенная буржуазея. З правадырамі яе і меу параду нядауна бывшы камівояжэр Рады. У гэтум мабыць яму пашанцавала—німа ведама, няхай бы сабе. Поруч з гэстым цяперака раз'яджая і вяльможны консул беларускі—у чыня таго ж камівояжэра Рады. Трэба сказать—што гандліовая жылка з пачатку свайго быцьця маяцца у Рады. Каб прадаваць пасьпешна беларускі працоуны народ, трэ мець спраунуую машыну гандлю... ну, хоцькі б такую, як Скірмунтау парцыляцыйны банк.

Стары С.-Д.

Парада вучыцялеу беларусау усіх чыноу.

(Пачатак глядзі № 26).

22 ліпня парада распачалася зноу. На чараду дня былі даклады т. Урбановіча аб палажэньні эвакуіраваных беларускіх школ і Беларускаго вучыцяльства. Даклады з мейсц і даклады т. т. Мазура і Дварчаніна аб плане школьнаго дзэла на Беларусі. З дакладу, т. Урбановіча выявілася страшэнная карціна поунаго развалу школьнай беларускай справы, перспэктыва зністажэньня дазваньня усякаго жыцьця у гэтум напрамку, і як паследак—пэгроза духоунаго адзічаньня беларускаго народа. Каб гэтаго нядапусціць трэба прылажыць усю энергію, усе сілы усім тым, хто хоча дапамагчы нашаму забітаму, векамі пагарджанаму беларускаму народу.

З дакладау з мейсц выявілася тая самая карціна, а яшчэ боляй тоя што ніяк ня можна арганізаваць беларуская учыцяльства у забрануй частцы па прычы я цяжкаго уціску, у яком ачууся беларускі селянін, як частка сацыалістычнай працоунай бедноты с сацыяльным самасазнаньням і асабіста вучыцялі, як іх павадыры. Не глядзючы на гэта, прызнана неадкладным прыкладаць усе сілы, каб з арганізаваць яго, і выясняна пажаданьня, каб Культ.-Асьветны аддзел прышоу на дапамогу і распачау эняргычную працу у гэтум напрамку. На абудвым пытаньням выняс(я)ны рэзалюцыі, якія будуць прыведзяны далей.

Даклады т. т. Мазура і Дварчаніна як бы дапамагаюць адзін другому. Тав. Мазур малюя тую карціну школьнай справы, якою яна павінна быць на Беларусі у звязку с агульным будаваньнем школы у Рассейскай Сацыялістычнай Распубліцы, а т. Дварчанін указвая на тыя асобнасці, якія павінны адмечаць школу як школу беларускую. Т. Мазур, пераходзячы ад ніжэйшых інстанцыяу да вышэйшых, ад самай школы і першай яе арганізацыі, валаснога савета па Народнаму Абразаваньню да павятовых, губэрнскіх і абласного адзелау па народнай адукацыі, ен размяжоувая іх кампетэнцыі і указвая задачу кожнай арганізацыі, ды кліча усіх прыйсці на дапамогу Радавай Уласці у гэтум напрамку сваею шчыраю працаю, каб слова народны вучыцяль па праудзе было б такім, якім яно зычыць.

Т. Дварчанін, указвая, што апроч усяго таго, што сказау т. Мазур, трэба паказаць на тыя асобнасці, якія школа павінна мець на Беларусі. Перш-на перш ен кажа, што Беларуская справа есць справа разам с тым і сацыялістычная справа. Пад іменям Беларусау разумеяцца ня увесь народ з усімі клясcамі, а толькі адзін клясс працавітай бедноты селян і работнікау. Буржуазея у нас жыдоуская, памешчыцтва — польская, чыноуніцтва —велікаруская. Царскі урад быу заціказулян каб беларускі народ быу абрушаны. Цераз цэрквы і школы пачауся правадзіціся геты прынцып абрусіцельства, які цяжкім пластырам лажыуся на народ-вызываючы у ем устыд за сябе, за тоя, што ен прыналяжыць да некае нізшае нацыі, гаворыць толькі на „простай“, мужыцкай мове, так што пры сустрэчы з гаварачым па расейску ен знімау шапку. Апроч таго, справа у том, што рускі пасадзіцяльны нацыяналізм, ня маючу прыпынку сярод беларусау, нашоу перашкоду сярод польскіх нацыяналістау, якія цераз касцелы і школы працавалі над ассіміляцыяй беларусау, але у польскі бок. Беларусы раздзеліліся на два варожых станы і замест таго, каб разам зьяднаушыся іці проці сваіх агульных гнятацеляу—біліся сярод сабою. Інтэлігенцыя беларуская пашла у другія бокі і таксама пачала змагаціся паміж сабою, а на народ перастала глядзець. Праз гэта народ такі цемны, такі забіты. Сацыалістычная улада павінна рабіць іначай. Школа беларуская павінна палучыць аутаномію, дзе поруч с агульнымі заданьнямі сацыялістычнай школы, павінны быць уведзяны асобныя прадметы беларускай мовы, літэратуры і наагул беларусазнауства. Дзеля таго, каб народ беларускі пазнау самога сябе і лічыу сябе ня нізшым пасярод другіх, а чуу сябе, як роуны з роунымі. У канцы ен чытая рэзалюцыю, якая прымаяцца пошля прамоу Латышэнко і Васілевіча, якія падтрымлівалі рэзалюцыю. Абудва даклады вызвалі доугія оплескі. Рэзалюцыі аддадзены на распрацаваньня асобай камісіі. Пасля гэтаго парада перарываяцца і адкладваяцца яшчэ на адзін дзень.

На трэці дзень парады, 23 ліпеня, упершы чарод быу заслуханы даклад т. Арлова а рэвакуацыі учэбных завядзеніяу Беларусі і аб фінансіраваньні Беларускіх школ. Прымая на увагу пагрозу духоунаго адзічаньня белар. народу за німецьчыням школ на мейсцох і асаджваньня іх у глыбі Расеі—т. Арлоу прадлагая пастанову, каб рэвакуіраваць школы па

меры магчымасці назад, калі ня можна на старыя мейсца, та хоць у Радавую-частку Беларусі, пры чом у першы чарод павінны быць высланы такія школы, якія больш усяго патрэбны простаму беларускаму народу. Што датыкаяцца справы фінансіраваньня школау у аккупаванпуй частцы Беларусі, дзе вучыцелі, ня глядзючы на уціск ад немцау і ад буржуазеі, вядуць справу адукацыі народу, г. Арлоу выказвая пажаданьня, каб Радавая Уласць як толькі можна дапамагла ім.

Заслухаушы даклад, парада выносіць пастанову, каб бяз Бел. Нац. Камісарыяту ніхто не мог нічога рабіць з беларускімі школамі; школы павінны быць рэвакуіраваны па меры магчымасці у Беларусь у такой паступовасці: 1) Рамесьляныя школы, 2) Вучыцяльскія сэмінарыі і інстытуты, 3) Высшыя пачатковыя вучылішча і 4) Сярэднія школы. Аб фінасіраваньні школ пастаноуляна зрабіць камісію с прыстаунікау Камісарыяту Нар. Асьветы, Рады Народных Камісарау Зап. Вобласці і Культ.-Асьветнаго Аддзелу Бел. Нац. Камісарыяту каб расзмяркаваць правільна тую сумму, якая адпушчана на гэту справу у распаражэньня Рады Камісарау Зап. Вобласці, пасярод учыцялеу акупованнай часці Беларусі. Усе другія вучыцялі павінны даставаць па агульнаму палажэнню з мейсцовых Саветау.

Пры канцы быу пастаулян пункт аб арганізацыі учыцяльства пастаноуляна па прадлажэньню т. Мазура прысаедзініцца да хаурусу вучыцялеу інтэрнацыаналістау, залажыушы пры ем беларускую секцыю на гэтум парада закрылася.

Резолюція

Собранія гражданъ Бѣлоруссіи (рабочихъ Путиловскаго завода) отъ 4-го Августа 1918 года.

Собраніе гражданъ Бѣлоруссіи—(рабочихъ Путиловскаго завода) проживающихъ въ г. Петроградѣ, состоявшіяся 4-го Августа 1918 года, заслушавъ докладъ Завѣдывающаго Бѣлорусскимъ Отдѣломъ Комиссаріата по дѣламъ Національностей С. К. С. О. т. Ковшилло и представителя Центральнаго Бѣлорусскаго Комиссаріата въ Москвѣ т. Устиловича о дѣятельности и задачахъ Національнаго Комиссаріата постановило:

Выразить благодарность Центральному Бѣлорусскому Комиссаріату и Бѣлорусскому Отдѣлу Комиссаріата по дѣламъ Нац. С. К. С. О. за ихъ работу въ дѣлѣ реэвакуаціи Бѣлоруссовъ-бѣженцевъ и за стремленіе къ улучшенію экономическаго и правового быта трудовыхъ массъ. Собраніе выразило надежду, что и впредь работа національныхъ Бѣлорусскихъ учрежденій будетъ направлена всецѣло на сторону защиты правъ трудового Бѣлорусскаго народа и охраненія этнографическихъ его границъ отъ всякаго рода посягательствъ. Собраніе настойчиво требуетъ, чтобы средства для культурно-просвѣтительныхъ цѣлей Б. Н. К. и Б. О. и Отдѣленій были бы получены, а также была бы улучшена и реэвакуація бѣлоруссовъ-бѣженцевъ. Собраніе указываетъ, что прежде всего реэвакуація должна коснуться Бѣлоруссовъ-бѣженцевъ, расселившихся въ голодающихъ нынѣ губерніяхъ и что всѣ нуждающіеся бѣлоруссы-бѣженцы должны быть обезпечены необходимыми средствами для существованія.

Подписали:
Предсѣдатель **Козыревъ.**
Секретарь **Черепукъ.**

Резолюція

Собранія гражданъ—Бѣлоруссов (рабочихъ Путилоского завода), отъ 4-го Августа 1918 года.

Собраніе гражданъ—Бѣлоруссіи, (рабочихъ Путиловскаго завода), состоявшееся 4-го Августа с/г. обсудив вопросъ о современномъ политическомъ положеніи Бѣлоруссіи и въ частности вопросъ о необходимости переименованія такъ называемой Западной Области въ Бѣлоруссію, а также и вопросъ о необходимости созданія бѣлорусскаго представительства въ Центральной Коллегіи Комиссаріата по Національнымъ Дѣламъ, постановило, обратиться съ соотвѣтствующимъ ходатайствомъ въ Совѣтъ Народныхъ Комиссаровъ о незамедлительномъ проведеніи въ жизнь, какъ бѣлорусскаго представительства въ Центральную Коллегію Комиссаріата по Національнымъ Дѣламъ (при Совѣтѣ Народныхъ Комиссаровъ), такъ и въ отношеніи насажденія въ Бѣлоруссіи Бѣлорусской Совѣтской Власти. Для осуществленія означенныхъ цѣлей собраніе постановляетъ отправить въ Москву делагацію въ составѣ двухъ человѣкъ отъ бѣлоруссовъ рабочихъ Путиловскаго завода для непосредственнаго возбужденія ходатайства по вышеозначеннымъ вопросамо передъ Совѣтомъ Народныхъ Комиссаровъ.

Подписали:
Н. Козыревъ.
Секретарь И. Черепукъ.

2-я Резолюція.

Собраніе Бѣлоруссовъ—Моряковъ Балтійскаго флота и гражданъ Бѣлоруссіи, урожещевъ: Гродненской, Виленской, Минской, Могилевской, Смоленской и бѣлорусскихъ уѣздовъ Сувалкской, Ковенской, Курляндской, Черниговской, Орловской и Псковской губ., состоявшееся 3-го Августа 1918 года въ г. Кронштадтѣ, обсудивъ вопросъ о „современномъ политическомъ положеніи Бѣлоруссіи“ и въ частности вопросъ о необходимости созданія бѣлорусскаго представитекьства въ Центральной Коллегіи Комиссаріата по Національнымъ Дѣламъ постановило: обратиться съ соотвѣтствующимъ ходатайствомъ въ Совѣтъ Народныхъ Комиссаровъ о незамедлительномъ проведеніи въ жизнь, какъ Бѣлорусскаго представительства въ Центральную Коллегію Комиссаріата по Національнымъ Дѣламъ (при С. Н. К.), такъ и въ отношеніи насажденія въ Бѣлорусскомъ краѣ Бѣлорусской Совѣтской Власти. Для осуществленія означенныхъ цѣлей собраніе постановляетъ отправить делегацію въ Москву въ составѣ трехъ человѣкъ отъ бѣлоруссовъ-моряковъ Балтійскаго флота для непосредственнаго возбужденія ходатайства по вышеозначеннымъ вопросамъ передъ Совѣтомъ Народныхъ Комиссаровъ.

Подписали: Предсѣдатель **С. Костинъ.**
Секретарь **Ракитскій**

Аб усім па троху.

З Беларусі.

У забрануй Магіліоушчыня весь ураджай у селян адбіраяцца. Немцы памешчыкау пячапаюць· Хто-ж хавая ураджай, таму грозіць ня меняй году вастрогу, або 6,000 р. штраху. З-за гэтаго бываюць бойкі паміж немцамі і селянамі, якія захапляюць цэлыя паветы.

З Вітабшчыны пішуць, што харошы ураджай гэтаго году вынудзіу спусціць цану з хлеба з 350 р. за пуд, да 170 р. Пры тым і хлеба на рынках пабольшылася заметна.

У Смаленску надоячы вобласная надзвычайная каміс'я змерцвіла бышаго пры цары жандарскаго палкоуніка Левендаля і ротмістра Ашэнбрэннера за тоя, што яны перайшлі у белагвардзейскую організацыю, каб бароцца супроціу цяперашняй уласці.

У гор. Мсціслава з,явілася і хутка паусюжыцца Гішпанская хвароба. Хвароба завецца Гішпанскаю таму, што спершаго у Гішпані ушчалася. Гэта хвароба прыстае з прычыны голаду. Вучоныя покуль што яшчэ яе нярасназналі, хоць яна разышлася па усім сьвеці і змерцвіла шмат людзей.

У сёньняшнім часе у Вітабску склікаяцца губэрская канфэрэнцыя бальшавікоу. На парадак будуць рашацца пытаньня: даклады з мейсцоу, бягучы момант, арганізацыя вясковых беднякоу і вобласная абеднаньня.

Вітабскі губэрскі ваенны камісар'ят ушчыняя агульную навуку ваеншчыня людзей 10 узростау (з 1890 г. да 1900 г.).

У Вітабску з-за вуглу прадауніцкім выстралам забіт старшыня камітэту бедных гичарбінскае воласці. Страляючы схавауся.

У Себежскум павеця паспешна закладаюцца камітэты беднякоу. Наладжваяцца так сама і культурна-асьветная праца. Рубежанскі, напрыклад, камітэт выпісвая 15 камуністычных выданьняу. Поміж з гэстым прыхіл да радавае уласці расце. Надоячы у аднэй воласці селяня самавольна сталі дзяліць ураджай на полі, што ішло супроць распараджэньняу Радавай уласці. Тагды другая частка селян успрацівілася і пацягнула іх праз надзвычайную кам. да суду.

З-заграніцы.

Немцы за увесь час палажылі на забраную імі Бэльгію 2 мільярды 303 міл. франкау (на наш стары рубель—франк—37½ к.) кантрыбуцыі (ваенныя падаткі); сюды яшчэ ня увайшлі усе узыскі, якія браліся з асобных людзей.

У Англі вайна выбрала да таго шмат людзей, што цяперака іх у яе няхапая. З гэстае прычыны надоячы міністэрства ліотау у паветры (воздухоплаванія) абвясціла, што яму патрабуюцца ля доужнасці ахвіцэрау у каралеускія авіціонныя (летальныя) часткі кабеты, якім ад роду ня меньш 25 гад. і ня боляй 15.

Рымскі папяж стараяцца, каб аслабаніць бышую расейскую царыцу і яе чатырох дочак. Ен хоча забраць іх харчаваць і даглядаць на свой кошт.

Само Фінляпская чорнасотніцкая правіцяльства сазнаяцца, што іх арыштована да 25 юля у Фінляндзі 50.812 „бунтаушчыкоу“· Тыя ж весткі гаворуць, што у 20 днёх юня лік запертых у фінскіх вастрогах чырвоных і дзеячау пралятарскае равалюцыі дайходзіла да 74,000 чал. З гэстаго ліку арыштованых да 25 юля было апраудана 723. Астатніх прыгаварылі сядзець у вастрогах часткаю, а часткаю с тымі ці іншымі варункамі да асвабаджэньня. Весткі гэты зусім ня кажуць, колькі было растрэляна і колькі забіта буржуйнымі палашамі.

Немцы маюць весткі, што яны патапілі англіскаго флоту на 5 мільон. тон (61 пуд тона) змеру.

Швэйцарская газэта «Бэрнэр Тагэблат» павядамляя, што Англія абяцая атдаць Японі галанскія калёні у конт платы за яе далуку у сусьветнуй вайне.

У Бэрлін прыехала дэлягацыя ад „Крымскаго правіцяльства.

З-Расеі.

Праз тоя, што палажэньня вучыцялеу сярэдняе школы з прычыны адмены галодных прыбавак, нягледзючы на пабольшаньня платы, усіож ткі пагоршала, Гасударская калег'я камісар'яту люцкоя асьветы пастанавіла кабтая прыбаука, якою карыстаюць вучыцялі ніжэйшай школы, была дадзяна і вучыцялям сярэдняй школы.

Сібірская правіцяльства разрабляя закон, па якім будуць надзяляцца зямлёю тыя чэхі, што б'юцца супроць Радавае уласці.

Расейская газэта „Вячернія Известія“ падлічвая, колькі патрабавала сучасная вайна людзей, дзеля зніщчэньня аднымі другіх і дзеля абслугі гэтаго знішчэньня. Гэтак, па яе падліку чалавецтва паставіла пад ружжо ажні 55 мільіонау чалавек!

Францыя—4½ міл., Англія—3½ міл., Італія—2 міл., Амэрыка—1½ міл., Гэрманьня—6 міл., Аустра-Вэнгрыя—3½ міл., Расея—7 міл., іншыя краі—2½ міл.—разам 30½ міл.

Забіта на вайне: У Францыі—500 тыс., у Англі—300 тыс., у Італі—300 тыс., у Амэрыцца—100 тыс., у Гэрманьні—мільіон, у Аустрыі—800 тыс., у Расеі—1 міл.,—разам, з далукаю іншых старон—4½ міл.

Калек: у Францыі—600 тыс., у Англі—300 тыс., у Італі—300 тыс., у Амэрыкі—10 тыс., у Гэрмапі—1 міл. 300 тыс., у Аустры—1 міл., у Расеі—1 міл., з другімі старанамі—каля 5 міл.

Палонных усіх разам—7 міл. 300 тыс. Далей. У Расеі на патрэбы вайны працавалі: на заводах ваенных і у бойнуй фабрычна-заводскуй прамысловасці, перавернутай ля патрэб вайны, боляй 1½ м. рабочых, на чыгунках каля 800 тыс., у земскум і гарацком хаурусах, у арганізацыях гандліова-прамысловаго камітэту і інш. каля 1 міл. рабочых (у земскум хаурусе капалі акопы боляй 400 тыс.), у лазарэтах да 500 тыс., шылі паушубкі, шапкі, гатовілі боты, валенкі і інш. шылі белізну—каля мільіону (у аднэй Маскве было швачак каля 70,000 чал.); усяго 4,8 мільіонау работнікау.

Дык вось, у аднэй толькі Расеі да вайны было прыцягнута боляй аднэй дзісятай часткі усіх людзей, бач боляй 20 міл. чалавек самых здаровых і сільных.

У Вароняжу залажыуся ралігійна-сацыялісткі хаурус, які задауся мэтаю праводзіць аслабаджэньня ад вяковаго ралігійна-уцягняннаго абмапу, у якім духавенства трымала народ, стараючыся пад гэтым, нібы пад тулям рабіць цёмную справу барацьбы супроць равалюцыі.

У Маскве залажыуся хаурус савецкіх журналістау. Мэта яго бараніць інтарэсы сваіх сяброу, даваць помач няймючым, падгатауляць журналістау новаго тыпу. Выраблян устау і 18 аугуста на агульнум сходзя зацьверджан.

З-Украіні.

На Украіня у рожных местох вядзецца паустаньня і ідуць бойкі між немцамі і паустанцамі.

Сярот украінскіх самасційнікау расце апаска за цэласць нязалежнасці Украіны. За гэтым у іх у апошні час пачау расці нахіл да Аустра-Вэнгры, якая па іх думца, толькі адна можа сберагчы незалежнасць Украіны.

Правіцяльства Скарапацкаго прадало немцам 3.000.000 пуд. цукру па 100 мар. за пуд.

Радактуя і выдае Друкарскі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Типографія Сов. Раб. и Солд. Деп. Москва, Тверская, Мамоновскій пер., д. 12.